Назвы склонаў і склонавыя пытанні ў беларускай мове

| | |
|---|---|
| Назоўны (Nominativ) | хто? што? |
| Родны (Genitiv) | каго? чаго? |
| Давальны (Dativ) | каму? чаму? |
| Вінавальны (Akuzativ) | каго? што? |
| Творны (Instrumentál) | кім? чым? |
| Месны (Lokál) | пры кім? пры чым? |

Скланенне назоўнікаў жаночага роду адзіночнага ліку
тыпы ***сцяна, сястра, зямля/ акадэмія***

*1. аснова на цвёрды зычны*

Н. сцян-**а**
Р. сцян-**ы**
(кніг-**і** – назоўнікі з асновай на г, к, х)
Д. сцян-**е***
В. сцян-**у**
Т. сцян-**ой** **(ою)** пад націскам
кніг-**ай** **(аю)** не пад націскам
М. аб сцян-**е***

*2. аснова на зацвярдзелы зычны ж, ш, дж, ч, р, ц + назоўнікі з асновай на -к і націскам на аснове* **

Н. сястр-**а**
Р. сястр-**ы**
зямельк-**і**
Д. сястр-**ы****
В. сястр-**у**
Т. сястр-**ой** **(ою)** пад нац.
афіш-**ай** **(аю)** не пад нац.
М. аб сястр-**ы****

*3. аснова на мяккі зычны/ на галосны*

Н. зямл-**я**
Р. зямл-**і**
Д. зямл-**і**
В. зямл-**ю**
Т. зял-**ёй** **(ёю)** – пад націскам
патэльн-**яй** **(яю)** – не пад націскам
М. на зямл –**і**

Н. фантазі-**я**
Р. фантазі -**і**
Д. фантазі -**і**
В. фантазі -**ю**
Т. фантазі -**яй** **(яю)**
М. у фантазі -**і**

* У Давальным і месным склонах адбываюцца наступныя чаргаванні:

| г//з’ | к//ц | х//с’ |
|---|---|---|
| *кніга//кнізе* | *дачка//дачцэ* | *страха//страсе* |

** Як ***сястра*** скланяюцца таксама назоўнікі з асновай на ***–к*** тыпу *рэчка,* у якіх націск прыпадае на аснову(!) Напрыклад: *зямелька, цацка, вішанька.* Асаблівасцю скланення такіх назоўнікаў з’яўляецца тое, што ў давальным ды месным склонах адбываецца **чаргаванне к//ц** і ўжываецца канчатак ***–ы*** (параўн.: рака – аб рацэ, рэчка – аб рэч**цы**). Таксама ў родным склоне ўжываецца канчатак ***-і*** (зямелька – зямельк-**і**). У родным склоне **множнага ліку** гэтыя назоўнікі маюць нулявы канчатак, перад **–к** у такіх словах будзе беглы галосны: рэчак, цацак, вёсак, вішанек (**а** – калі перад ***к*** цвёрды гук, **е** – перад ***к*** – мяккі гук).

Скланенне назоўнікаў жаночага роду множнага ліку
тыпы ***сцяна, зямля/ фантазія***

*1. аснова на цвёрды зычны*

Н. сцен-**ы**
Р. сцен*
бітв-аў
вёс**а**к
Д. сцен-**ам**
В. сцен-**ы**
дзяўчын**
Т. сцен -**амі**
М. аб сцен -**ах**

*3. аснова на мяккі зычны/ на галосны*

Н. земл-**і**
Р. земл -**яў**
Д. земл -**ям**
В. земл -**і**
казуль (адуш.)**
Т. земл –**ямі**
М. на земл-**ях**

Н. фантазі**-і**
Р. фантазі -**й**
Д. фантазі -**ям**
В. фантазі -**і**
Т. фантазі -**ямі**
М. у фантазі –**ях**

* Канчаткі роднага склону множнага ліку ў назоўнікаў жаночага роду выклікаюць найбольш пытанняў. Але на самой справе не прадстаўляюць асаблівых цяжкасцяў. Родны склон мае канчаткі:

- -аў (-яў) – назоўнікі, аснова якіх заканчваецца збегам зычных: падэшва – падэшваў, лічба – лічбаў, зямля – земляў.

- Нулявы – у назоўнікаў, аснова якіх заканчваецца аднім зычным: *сцяна – сцен, рука – рук;*

- нулявы у назоўнікаў, аснова якіх заканчваецца на збег зычных, апошні з якіх – ***к*** - *сцежка – сцежак, вёска – вёсак, хатка – хатак;* перад –**к** у такіх словах будзе беглы галосны (**а** – калі перад ***к*** - цвёрды гук, **е** – калі мяккі гук) : рэч**а**к, цац**а**к, вёс**а**к, вішан**е**к.

- нулявы – назоўнікі, якія заканчваюцца на -ыя (-ія) *фантазій, армій, станцый, ілюзій*

** У вінавальным склоне множнага ліку адрозніваюцца канчаткі адушаўлёных і неадушаўленых назоўнікаў. У адушаўлёных назоўнікаў ужываецца канчатак роднага склону.

Скланенне назоўнікаў ніякага роду адзіночнага ліку
тыпы ***сяло, поле, паселішча, мястэчка***

Назоўнікі ніякага роду скланяюцца падобна, як назоўнікі мужчынскага роду.

| *Аснова на цвёрды зычны* | *Аснова на зацвярдзелы зычны* |
|---|---|
| Н. сял-**о** | Н. паселішч-**а** |
| Р. сял-**а** | Р. паселішч-**а** |
| Д. сял-**у** | Д. паселішч-**у** |
| В. сял–**о** – пад націскам<br>неб-**а** - не пад націскам | В. паселішч–**а** |
| Т. сял-**ом** – пад націскам<br>неб-**ам** - не пад націскам | Т. паселішч-**ам** |
| М. у сял–**е** | М. у паселішч-**ы** |

| *Аснова на –г, -к, -х* | *Аснова на мяккі зычны* |
|---|---|
| Н. мястэчк-**а** | Н. пол-**е** |
| Р. мястэчк-**а** | Р. пол-**я** |
| Д. мястэчк-**у** | Д. пол-**ю** |
| В. мястэчк-**а** | В. пол–**е** |
| Т. мястэчк-**ам** | Т. пол-**ем** |
| М. у мястэчк–**у** | М. у пол-**і** |

Скланенне назоўнікаў ніякага роду множнага ліку
тыпы ***сяло, поле***

| *Аснова на цвёрды зычны* | *Аснова на мяккі зычны* |
|---|---|
| Н. сёл-**ы** | Н. пал -**і** |
| Р. сёл-**аў** | Р. пал- **ёў** |
| Д. сёл-**ам** | Д. пал-**ям** |
| В. сёл–**ы** | В. пал–**і** |
| Т. сёл-**амі** | Т. пал -**ямі** |
| М. у сёл–**ах** | М. у пал-**ях** |

склон (pád), скланенне (skloňování), назоўнік (substantivum), жаночы род (ženský rod), мужчынскі род (mužský rod), ніякі род (střední rod), адзіночны лік (jednotné číslo), множны лік (množné číslo), аснова (kmen), зычны гук (souhláska), галосны гук (samohláska), цвёрды гук (tvrdý), мяккі гук (měkký), зацвярдзелы гук (vždy tvrdý), чаргаванне (alternace), адбывацца (probíhat).